**А. Л. КАРАЦЕЕЎ, канд. мастацтвазнаўства (Беларускі універсітэт культуры)**

# АПТЫМІЗАЦЫЯ ПАДРЫХТОЎКІ І ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ ФОРМЫ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ ДЫРЫЖОРАЎ ДУХАВЫХ, ЭСТРАДНЫХ АМАТАРСКІХ І ПРАФЕСІЙНЫХ АРКЕСТРАЎ ЯК УМОВА ЯКАСНАГА РАЗВІЦЦЯ ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА Ў СТРУКТУРЫ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Абавязковай умовай развіцця, залогам творчых поспехаў прафесійнага ці аматарскага духавога аркестра з'яўляецца майстэрства, эрудыцыя, энтузіязм і апанаванасць музыканта, які кіруе калектывам. Сітуацыя складваецца такім чынам, што для многіх аматараў музычнага мастацтва ў прафесійным калектыве гэта, безумоўна, дырыжор ці, пры наяўнасці некалькіх дырыжораў, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор, а ў аматарскіх аркестрах такі лідэр завецца проста кіраўніком калектыву. Але і ў прафесійным, і ў самадзейным духавым, эстрадным аркестры вельмі многае вызначаецца дырыжорам, хоць і ў тым, і ў іншым відзе духавога, эстраднага аркестра маецца свая спецыфіка, існуюць свае праблемы. Акрамя таго, назіраецца і некаторая блытаніна з тэрмінамі "аматарскі" і "самадзейны" (калектыў), на чым варта спыніцца асобна.

Адзначым, што дагэтуль не сціхаюць дыскусіі спецыялістаў-практыкаў, вучоных, якія даследуюць праблему існавання і развіцця самадзейнага мастацтва [1]. Ю. Кулікоў, напрыклад, разглядаючы культуралагічны аспект тэорыі самадзейнага мастацтва, падкрэсліваў, што самадзейнасць — гэта новая сацыякультурная форма непрафесійнага мастацтва і шырэй — народнай творчасці. Даволі грунтоўна праблема ўзаемаадносін прафесійнага і самадзейнага мастацтва была разгледжана на другім фестывалі мастацкай самадзейнасці сацыялістычных краін у г. Брно пры абмеркаванні рэфератаў І. Вітані (Венгрыя), С. Гарстэан (Румынія), М. Барташ (Чэхаславакія), Л. Сонцавай (СССР). Заслугоўвае ўвагі і разважанне І. Малахавай аб сутнасці тэрмінаў "мастацкая самадзейнасць" і "аматарская творчасць" [2].

З улікам практыкі прыцягнення ў так званыя самадзейныя духавыя, эстрадныя аркестравыя калектывы прафесійных выканаўцаў[1], якая аб'ектыўна склалася ў час правядзення аглядаў, конкурсаў, фестываляў і да т. п., сярод спецыялістаў пастаянна ўзнікаюць спрэчкі: якія ж калектывы аднесці да самадзейных, а якія — да аматарскіх? Сваю версію наконт гэтага прапанаваў, напрыклад, вядомы кампазітар, даследчык духавой, эстраднай музыкі Дз. Браслаўскі ў сваім дакладзе на навукова-практычнай канферэнцыі па праблемах развіцця духавой музыкі, што праходзіла ў час правядзення першага Усесаюзнага свята духавой музыкі (Мінск, 1977). Так, ён прапанаваў замяніць існуючы тэрмін "самодеятельный духовой оркестр" двума іншымі, якія, на яго погляд, дадуць

[1] Ваенныя музыканты, аркестранты прафесійных саставаў, удзельнікі вучэбных калектываў дзіцячых музычных школ, музычных вучылішчаў, ліцэяў, Беларускай акадэміі музыкі, Беларускага універсітэта культуры і да т. п.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш ясную карціну сапраўднага стану спраў, які склаўся ў выканальніцкай практыцы жанру духавой музыкі.

"Неабходна, — падкрэсліваў Дз. Браслаўскі, — усе самадзейныя духавыя аркестры раздзяліць на дзве групы, з якіх першую лічыць аматарскімі духавымі аркестрамі, а другую — самадзейнымі. Да першай групы трэба аднесці тыя духавыя аркестры, у складзе якіх пераважаюць удзельнікі з высокай ступенню выканальніцкага майстэрства, якія маюць спецыяльную музычную адукацыю ці вялікі практычны стаж або вопыт ігры на інструменце (гэта навучэнцы і студэнты спецыяльных музычных навучальных устаноў, што рыхтуюцца да будучай прафесійнай дзейнасці, прафесійныя музыканты-пенсіянеры, якія працягваюць займацца музыкай, і інш.). Самадзейнымі трэба лічыць духавыя аркестры, якія не маюць высокай ступені выканальніцкага майстэрства і ў якіх большасць выканаўцаў без музычнай падрыхтоўкі... Такі дыферэнцыраваны падыход, — на думку Браслаўскага, — дае магчымасць больш аб'ектыўна ацэньваць дзейнасць духавых аркестраў на ўсіх мерапрыемствах" [3].

Як бачым, усе разважанні Браслаўскага зводзяцца толькі да аднаго — які прафесійны ўзровень таго ці іншага калектыву, без аналізу сутнасці кожнага з іх.

Не засяроджваючыся на гістарычных перыпетыях узнікнення самой з'явы мастацкай творчасці ў сферы вольнага часу і праяўленні розных тэрмінаў і паняццяў, што суправаджаюць яго развіццё, адзначым, што з нашага пункту гледжання тэрмін "самадзейны калектыў" не падыходзіць да тых калектываў, якія ўключаюць энтузіястаў жанру — або прафесійных музыкантаў, або аматараў, бо і тых і іншых аб'ядноўвае агульнасць і выбіральнасць *інтарэсаў* да заняткаў, выступленняў у складзе мастацкага калектыву ў свой *вольны* час. Розніца паміж удзельнікамі заключаецца ва *ўзроўні* іх *падрыхтоўкі.* Таму, на наш погляд, тэрмін "самадзейны выканаўца" не адпавядае тэрміну "удзельнік мастацкага калектыву (аркестравы, харавы, танцавальны, тэатральны) сферы вольнага часу", бо ў рамках такога калектыву ён не займаецца самадзейнасцю як такой, а ўдасканальвае сваё выканальніцкае майстэрства, эмацыянальна, эстэтычна развіваецца і духоўна ўзбагачаецца пад *кіраўніцтвам* прафесійна абучанага дырыжора, знаходзіцца ў пастаянных міжасобасных зносінах з іншымі ўдзельнікамі калектыву, якія таксама аказваюць прамы або ўскосны ўплыў на яго станаўленне як асобы. Самадзейным жа выканаўцам як такім можна назваць, на наш погляд, *асобнага* выканаўцу-энтузіяста (гітарыст, гарманіст, выканаўца на якім-небудзь народным інструменце, у тым ліку і на духавым, і да т. п.). У гэтым ракурсе правамерна разглядаць і дзейнасць самадзейных мастакоў, кампазітараў, фатографаў і г. д., што з прычыны прыроднай адоранасці, настойлівай работы і самаадукацыйнай працы дасягаюць пэўных мастацкіх вынікаў. Таму ў дадзеным артыкуле замест традыцыйна існуючага тэрміна "самадзейны" духавы, эстрадны аркестр намі прапануецца назва "аматарскі" духавы, эстрадны аркестр. Наша пазіцыя поўнасцю супадае і з пунктам гледжання Л. Аляксеевай, якая адзначае, што ў сапраўдным мастацтве не можа быць розных мерак, розных патрабаванняў, з'яўляецца гэтае мастацтва прафесійным або самадзейным. Крытэры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва, на думку гэтага аўтара, — гэта высокамастацкі ўзровень, эстэтычнае задавальненне запатрабаванняў людзей [4].

У працэсе даследавання асаблівасцей музычнага мастацтва ў структуры мастацкай культуры Беларусі намі выяўлена як адна з актуальных праблем у дзейнасці аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў супярэчнасць паміж тэндэнцыяй *актывізацыі цікавасці* слухачоў да такіх калектываў і *недастатковым узроўнем* прафесійнай падрыхтоўкі іх кіраўнікоў, што адбіваецца на якасці выканальніцкай дзейнасці калектываў. А гэта не адпавядае сучасным патрабаванням развіцця музычнага мастацтва і мастацкай культуры ў цэлым. Аналіз паказаў, што духавымі аркестрамі, напрыклад, у асноўным кіруюць музыканты-практыкі. Да іх мы адносім спецыялістаў з ліку ваенных дырыжораў, музыкантаў, якія закончылі тэрміновую або звыштэрміновую службу ў духавым аркестры, ансамблі песні і танца, а таксама артыстаў, што працавалі раней у прафесійных аркестрах або ансамблях. Шэраг калектываў узначальваюць сапраўдныя энтузіясты-аматары жанру (народны духавы аркестр ДК гомельскага ФанДОКа, кіраўнік Ю. П. Згерскі). Але часта аркестрамі кіруюць не падрыхтаваныя для такой работы дылетанты або нават выпадковыя людзі (у асноўным такое назіраецца ў духавых і эстрадных аркестрах і ансамблевых саставах у сістэме прафтэхадукацыі рэспублікі). Сярод кіраўнікоў і духавых, і эстрадных аркестраў (ансамбляў) прадстаўнічая група выпускнікоў музычных вучылішчаў, але амаль адсутнічаюць спецыялісты з вышэйшай адукацыяй.

Такое становішча не садзейнічае развіццю духавога і эстраднага аркестравага выканальніцтва на высокім якасным узроўні, не забяспечвае ў поўнай меры максімальнае развіццё кожнага ўдзельніка калектыву як асобы.

З асноўных недахопаў кіраўнікоў аматарскіх духавых і эстрадных аркестраў рэспублікі, выяўленых намі ў працэсе даследавання, адзначым толькі наступныя:

1) недастатковая прафесійная кампетэнтнасць шэрага кіраўнікоў. У асноўным гэта датычыць аркестраў духавых інструментаў, паколькі работа з эстраднымі калектывамі ўсё ж прадугледжвае дастаткова канкрэтнае кола ведаў і нават для кіраўнікоў-аматараў дастатковыя выканальніцкія навыкі (абследаванне паказала, што, як правіла, такія кіраўнікі нядрэнна валодаюць або гітарай, або клавішнымі інструментамі, маюць добрую слыхавую практыку);

2) адсутнасць абвостранага пачуцця адказнасці за сваю прафесійную дзейнасць з пункту гледжання сацыяльнага прэстыжу жанру;

3) адсутнасць у кіраўнікоў развітых навыкаў прыняцця самастойных творчых рашэнняў і нежаданне іх ажыццяўлення. Сюды мы адносім складанасці ў падборы рэпертуару для канцэртных праграм і выступленняў у час абслугоўвання сацыяльна значных і культурна-масавых мерапрыемстваў, няўменне выканаць кваліфікаваную інструментоўку (аранжыроўку), знайсці прагрэсіўныя сістэмы і методыкі індывідуальнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў калектыву і да т. п.;

4) абмежаванне ў рабоце з удзельнікамі калектываў толькі навучаннем іх выканальніцкім навыкам ігры на розных інструментах духавога або эстраднага аркестра і *неразуменне* галоўнай задачы ў рабоце аматарскіх калектываў — задавальнення інтарэсаў у сферы вольнага

часу і развіцця кожнага з удзельнікаў як асобы сродкамі музычнага мастацтва;

5) няправільнае ўяўленне аб узроўні мастацка-эстэтычных арыенціраў у духавой або эстраднай музыцы;

6) абмежаваны кругагляд, недастатковая ступень эрудыцыі ў галіне музычнага мастацтва і як вынік — несфарміраваны мастацкі густ многіх кіраўнікоў;

7) адсутнасць выканальніцкіх навыкаў імправізаванай ігры і методыкі навучання гэтым навыкам удзельнікаў эстрадных калектываў;

8) негатоўнасць кіраўнікоў весці платную канцэртна-выканальніцкую дзейнасць сваіх калектываў у новых эканамічных умовах.

Мэту навучання будучых кіраўнікоў духавых і эстрадных аркестраў (ансамбляў) у ВНУ неабходна вызначаць як падрыхтоўку высокакваліфікаванага, усебакова эрудзіраванага ў галіне музычнага мастацтва спецыяліста з максімальным развіццём яго дзелавых якасцей (творчая актыўнасць, арганізатарскія і педагагічныя здольнасці, уключэнне элементаў навукова-даследчай работы і аналітычнага падыходу з мэтай рэгулявання дзейнасці калектыву і да т. п.) [5]. Гэтыя якасці павінны ўдасканальвацца ў працэсе практычнай дзейнасці выпускнікоў са сваімі калектывамі. Па канчатковым выніку падрыхтоўкі кіраўніка трэба ацэньваць і працу выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін.

Вывучэнне дакументаў паказала, што раней выпускнікі спецыялізацыі “Кіраўнік самадзейнага духавога, эстраднага аркестра” на размеркаваннях на работу аддавалі перавагу такім спецыяльнасцям, як:

1) метадыст-арганізатар культурна-асветніцкай работы (лічачы такую прафесію больш лёгкай);

2) мастацкі кіраўнік самадзейных калектываў КАУ (лічаць, што не будуць сутыкацца са складанымі пытаннямі непасрэднага стварэння свайго калектыву па атрыманай спецыяльнасці);

3) намеснік дырэктара Палаца культуры або клуба і да т. п.

Вывучэнне матывацыі ўхілення ад сваёй магчымай прафесіі сведчыць аб тым, што будучыя кіраўнікі баяцца практычнай работы. Прычына тут у тым, што ў працэсе навучання ў ВНУ такія студэнты не здолелі спалучыць тэарэтычныя веды з развіццём сваіх практычных навыкаў.

Акрамя таго, на наш погляд, тут назіраецца і яшчэ адзін істотны недахоп у падрыхтоўцы спецыялістаў — іх самастойная, самаадукацыйная работа, значнасць якой недаацэньваюць самі студэнты. Яна павінна стаць сур’ёзным аб’ектам даследаванняў і саміх выкладчыкаў. Даволі грунтоўна праблему арганізацыі самастойнай дзейнасці студэнтаў мастацкіх спецыялізацый вывучала Я. Грыгаровіч, вынікі даследавання якой даюць поўнае ўяўленне не толькі пра стан праблемы, але і абгрунтоўваюць канкрэтныя апрабіраваныя шляхі яе частковага вырашэння [6].

На працягу ўсяго перыяду навучання выкладчыкі даюць студэнтам разнастайныя, грунтоўныя веды па агульнанавуковых і спецыяльных дысцыплінах з улікам патрабаванняў сённяшняга дня. У сувязі з гэтым зусім натуральна, што студэнт павінен вучыцца выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі, якія сфарміруюць яго як спецыяліста. Адной з абавязковых умоў навучання студэнтаў павінна стаць імкненне іх да

самастойнай, самаадукацыйнай работы, развіццё неабходных навыкаў у гэтым плане. Таму што пасля сканчэння ВНУ малады спецыяліст, які ўжо ў канкрэтных жыццёвых сітуацыях выявіць свае прабелы ў ведах, акрамя таго, што асабістай самаадукацыйнай работай павінен будзе іх ліквідаваць, яшчэ павінен арганізаваць работу з удзельнікамі свайго духавога, эстраднага аркестра такім чынам, каб і яны засвоілі пэўныя навыкі самастойнай работы на сваіх індывідуальных занятках, як на музычным інструменце, так і пры знаёмстве са спецыяльнай і нотнай літаратурай, магнітафоннымі, грамафоннымі і відэазапісамі і да т. п.

У сучаснай практыцы кіраўнікоў калектываў існуюць праблемы, да якіх можна было б падрыхтавацца яшчэ ў навучальнай установе. У эстрадных аркестрах, напрыклад, узнікаюць сітуацыі, калі пры аранжыроўцы твораў, падборы мастацкага рэпертуару кіраўнік не ўмее зарыентавацца і прааналізаваць сучасныя плыні і стылі джазавай, эстраднай музыкі, не ў стане размежаваць высокамастацкія творы і нізкапробны "дэсерт". У калектывах духавых аркестраў маладыя кіраўнікі таксама няўпэўнена адчуваюць сябе ў пытаннях фарміравання рэпертуару, губляюцца ў падборы комплексаў неабходнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў для індывідуальнай і агульнааркестравай падрыхтоўкі і г. д. Таму і ўзнікаюць сітуацыі, калі выпускнікі баяцца сваёй работы, нават не прыязджаюць на месцы размеркавання, а калі і застаюцца адзін на адзін з людзьмі, што прыйшлі займацца любімай справай, то не могуць як след арганізаваць работу і таму вымушаны пакідаць калектыў. Усё гэта адбываецца з-за няўпэўненасці ў самастойным пераадоленні аб'ектыўных цяжкасцей, што ўзнікаюць у кожнай справе, асабліва калі гэта датычыць творчай працы.

Высокакваліфікаваны спецыяліст, эрудзіраваны і падрыхтаваны да любых цяжкасцей, — вось ідэальны вынік работы выкладчыкаў выпускаючых кафедраў. І, зразумела, увесь прафесарска-выкладчыцкі састаў цікавіць, якім будзе іх выпускнік, ці гатовы ён быць сапраўдным майстрам сваёй справы, ці здольны фарміраваць мастацкія густы людзей, развіваць іх эстэтычна, эмацыянальна, найлепшым чынам змагацца за свой жанр, папулярызуючы лепшыя ўзоры духавой, эстраднай музыкі. Пры вызначэнні такіх перспектыў неабходны сур'ёзны падыход да складанага працэсу фарміравання будучага спецыяліста з улікам індывідуальных асаблівасцей і схільнасцей кожнага студэнта, з выключэннем з гэтага шматграннага працэсу элементаў фарсіравання. Навучанне ў ВНУ — гэта не толькі перыяд фарміравання інтэлектуальна-мысліцельнай дзейнасці, натуральнага сталення маладога чалавека, але напружаны, цяжкі пошук, калі чалавек фарміруе свой унутраны свет, выпрацоўвае эстэтычныя, маральныя, духоўныя арыенціры, вырашае свой лёс. Чым хутчэй студэнт уцягнецца ў вучэбны працэс ВНУ, навучыцца самастойна працаваць і дыхаць азонам творчасці, тым хутчэй ён стане кваліфікаваным спецыялістам, сфарміруецца як асоба.

Як жа абудзіць, накіраваць і выхаваць жаданне студэнта творча працаваць самастойна? Тут уся адказнасць ляжыць на выкладчыку, які ў працэсе навучання студэнта павінен прывіць яму неабходныя навыкі і імкненне да напружанай самастойнай працы. Намі былі вывучаны лекцыйныя заняткі па спецыялізацыі ("Інструментазнаўства", "Методыка работы з аркестрам і ансамблем" і інш.), практычныя і дробнагрупавыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заняткі (аркестравы клас: духавы, эстрадны аркестр — біг-бэнд, эстрадна-сімфанічны[2], фальклорны, ансамблі духавых інструментаў, інструментальныя эстрадныя ансамблі — стрынг-бэнд, ансамблі тыпу “комба”), а таксама індывідуальныя заняткі па спецінструменце, дырыжыраванні, інструментоўцы, аранжыроўцы, чытанні аркестравых партытур, вывучэнні аркестравых інструментаў, на якіх выкладчык слоўна ці асабістым паказам (элементы дырыжыравання), выкананнем на інструменце асобных фрагментаў ці ўсяго твора (спецінструмент, чытанне партытур, інструментоўка, аранжыроўка) стымулюе і развівае выканальніцкія навыкі студэнта, расшырае яго творчыя магчымасці і папаўняе яго веды. Даследаванне паказала, што ў час гэтых заняткаў выкладчык дае рафініраваны, канцэнтраваны матэрыял у гатовым выглядзе. Такі спосаб перадачы ведаў студэнтам іграе, канечне, пэўную ролю, але практычна паказвае, што толькі ім абмяжоўвацца нельга. І тут, безумоўна, на першы па значнасці план павінна выйсці самастойная работа студэнта, якая абавязкова, асабліва на першым этапе, павінна каардынавацца выкладчыкам. Ён вызначае студэнту канкрэтнае заданне па самастойнай рабоце, удакладняе ўвесь яе аб’ём, карэкціруе неабходныя формы, метады, сродкі для дасягнення пастаўленай мэты — авалоданне неабходным матэрыялам па спецыялізацыі. Немалаважнай умовай у гэтым плане будзе і вызначэнне аптымальнага аб’ёму і ступені складанасці самастойных заданняў, ад чаго будзе залежаць працягласць іх выканання. Абавязак выкладчыка заключаецца не толькі ў тым, каб адабраць для гэтага неабходны матэрыял, але і ў тым, каб акцэнтаваць увагу студэнта на асноўных момантах яго індывідуальных заняткаў. І ў гэтым выпадку самастойная работа студэнта будзе мець часткова кіруемы характар. У сувязі з тым, што немагчыма па аб’ектыўных абставінах дакладна рэгламентаваць затрачаны час і эфектыўнасць працы кожнага асобнага студэнта пры яго індывідуальных самастойных занятках, трэба ўлічваць, што самастойная работа з’яўляецца выключна *індывідуальным працэсам* і таму патрабуе ад студэнта ў жорсткіх умовах абмежаванасці часу вучэбнага працэсу чоткага, мэтанакіраванага і канкрэтнага падыходу да планавання і рэалізацыі пастаўленых задач. Патрэбна ўлічваць і тое, што заданні студэнт атрымлівае і па іншых, агульнаадукацыйных дысцыплінах, і таму выкладчык абавязаны ведаць бюджэт часу студэнта, паколькі менавіта ён і з’яўляецца немалаважнай умовай у арганізацыі самастойнай работы [7]. Тады ў час індывідуальных самастойных заняткаў са спецыяльнай ці нотнай літаратурай, практычных заняткаў па спецінструменце, дырыжыраванні, фартэпіяна, інструментоўцы, аранжыроўцы і г. д. студэнт будзе мець магчымасць займацца ў прымальным індывідуальным тэмпе, удзяляючы максімальна таму ці іншаму віду, участку работы неабходны час, а таксама актывізаваць самастойнасць мыслення пры планаванні і наступным выкананні заданняў у працэсе сваёй работы.

Для лепшай арыентацыі і развіцця творчых адносін студэнта да работы выкладчыку трэба ўдзяляць шмат увагі і другому віду самастойнай работы, калі студэнт *асабіста* вызначае сабе заданні (вывучэнне спецыяльнай

[2] Правільная назва ўсё ж “вялікі эстрадны аркестр”, паколькі калектыў уключае толькі састаў біг-бэнда і струнную групу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

літаратуры; аналіз партытуры; развучванне твора; знаёмства і выкананне фрагментаў з аркестравых ці ансамблевых цяжкасцей; работа над практыкаваннямі, эцюдамі, гамамі і да т. п. па спецінструменце). У гэтым выпадку студэнт сам павінен навучыцца вызначаць мэту, знаходзіць аптымальныя віды работы і выконваць іх. Пажадана, каб і гэты від самастойнай работы студэнта быў мэтанакіраваным, часткова рэгуляваўся і тактоўна кіраваўся. А для гэтага пасля падрыхтоўкі таго ці іншага віду задання выкладчыку варта правесці дакладны аналіз вынікаў працы студэнта з адпаведнымі каментарыямі, неабходнай карэкціроўкай з мэтай недапушчэння ўзнікшых памылак у наступных занятках навучэнца. Асноўным зместам любых відаў самастойных заняткаў павінна стаць работа па засваенні рознабаковых ведаў студэнтамі з мэтай набыцця неабходных навыкаў самастойнай працы і іх творчага прымянення ў будучай прафесійнай дзейнасці.

Павышаючы адказнасць студэнтаў за вынікі іх самастойнай працы на ўсіх стадыях навучання, выкладчыкі закліканы акцэнтаваць увагу навучэнцаў на максімальным развіцці навыкаў самакантролю. Дарэчы будзе тут выкарыстанне студэнтамі дапаможных сродкаў навучання (табліцы, схемы, графікі, фота- і відэаматэрыялы і да т. п.; музычныя запісы і да т. п.). Пад кіраўніцтвам выкладчыка магчыма складанне студэнтам індывідуальнага “Плана выканання самастойнай работы”, “Дзённіка выканання самастойнай работы”, па якіх можна ажыццяўляць перыядычны кантроль і, у выпадку цяжкасцей ці якіх-небудзь праблем, аператыўна аказваць дапамогу студэнту. Выкладчыку неабходна пастаянна помніць, што набытыя студэнтам веды становяцца не “ведамі дзеля ведаў”, а будуць арыентаваць студэнта ў прынцыпах набыцця іх і метадах выкарыстання ў будучай працоўнай дзейнасці. Вызначаючы на занятках аб’ём, змест, задачы, мэты заданняў, выкладчык закліканы актывізаваць і зацікавіць студэнтаў у мэтанакіраванай самастойнай рабоце. Пры гэтым важна помніць, што “самастойная, блізкая да даследчыцкай работа студэнта немагчыма без цікавасці да вывучаемай навукі. Яна мае неацэненае значэнне для выхавання творчай асобы, для якой пошук... — унутраная патрэба” [8]. Гэта магчыма толькі пры ўмове абавязковага ўключэння ў змест заняткаў новага матэрыялу, накіраванага на развіццё ў студэнтаў творчай актыўнасці ў рабоце з ім. А веды выкладчык павінен даваць з перспектывай, каб пры ўзрастаючых задачах тэхналагічнага, мастацкага плана дасягнуць максімалізацыі інтэлектуальна-мысліцельнай дзейнасці кожнага студэнта. Для паспяховага ажыццяўлення гэтага віду работы выкладчыку неабходна стварыць у сваім класе спрыяльны маральна-псіхалагічны, творчы клімат.

Канкрэтызуючы задачы па арганізацыі самастойнай работы кожнага студэнта, выкладчыку трэба планаваць, карэкціраваць заданні зыходзячы з індывідуальных магчымасцей навучэнцаў.

У строга вызначаныя тэрміны, што будуць дысцыплінаваць студэнта, выкладчык будзе прымаць падрыхтаваны студэнтам тэарэтычны і практычны матэрыял з абавязковым наступным аналізам як з боку студэнта, так і з боку выкладчыка. З мэтай нагляднасці вынікаў самастойнай працы студэнтаў прадметна-цыклавым камісіям можна арганізаваць творчыя справаздачы кафедр, у канцэртныя праграмы якіх будуць уключацца творы, падрыхтаваныя студэнтамі самастойна (дырыжыраванне з арке-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страм, сола з аркестрам, інструментоўка ці аранжыроўка для аркестра, ансамбля, выступленне ў складзе інструментальнага ансамбля і да т. п.). Як паказала даследаванне, многія студэнты, упэўнена выконваючы вучэбную праграму ў класе, на экзамене, заліку адчуваюць празмернае хваляванне і таму не могуць выканаць твор на стабільным узроўні. Тут неабходна шукаць розныя шляхі ліквідацыі такой з'явы, і адным з варыянтаў можа быць арганізацыя выступленняў-справаздач студэнтаў з самастойна падрыхтаванымі праграмамі напярэдадні сесіі перад сваімі аднакурснікамі, выкладчыкамі іншых класаў. Гэта дапаможа студэнтам пераадолець сцэнічны страх і выхаваць валявыя якасці, будзе ў значнай ступені спрыяць творчай актыўнасці студэнтаў, дазволіць павысіць іх прафесійны падыход да сваёй будучай прафесіі, будзе стымуляваць рост выканальніцкага майстэрства. Акрамя вядучага выкладчыка, дапамогу студэнтам у арганізацыі іх самастойнай работы павінны аказваць куратары акадэмічных груп, мастацкія кіраўнікі вучэбных аркестраў, лабаранты кафедраў, супрацоўнікі бібліятэкі (чытальная зала, абанемент, інфармацыйна-даведачны аддзел).

Улічваючы, што разгледжаныя намі віды самастойнай работы студэнтаў з'яўляюцца адной з важных умоў набыцця прафесійных якасцей будучых кіраўнікоў духавых, эстрадных аркестраў, мы прапануем наступныя шляхі яе ўдасканалення па ўсіх формах навучання (вучэбны працэс, вытворчая практыка, курсавыя работы, рэфераты, дыпломныя работы бакалаўраў і магістраў, анатацыі да выконваемых твораў, НДРС і інш.):

а) неабходнасць вызначэння *этапаў* арганізацыі самастойнай работы, што дазволіць структурна ўявіць яе змест у цэлым;

б) канкрэтызацыя заданняў для самастойнай работы, вызначэнне іх аптымальнага аб'ёму і ступені складанасці зыходзячы з агульнага бюджэту часу навучэнцаў, што дазволіць надаць самастойнай рабоце часткова кіруемы характар;

в) абавязковы ўлік міжпрадметных сувязей пры вызначэнні заданняў для самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў (агульнанавуковыя, музычна-тэарэтычныя, спецыяльныя дысцыпліны выпускаючых кафедр);

г) больш эфектыўнае прымяненне сучасных тэхнічных сродкаў навучання пры самастойных занятках студэнтаў па розных дысцыплінах;

д) пастаяннае развіццё ў студэнтаў самастойных навыкаў работы і аб'ектыўнае вызначэнне мэт, задач, сродкаў і метадаў пры арганізацыі самастойнай працы ў тым ці іншым напрамку;

е) удасканальванне работы студэнтаў з каталогамі, фондамі бібліятэк і максімальнае выкарыстанне міжбібліятэчных абанементаў з мэтай пошуку неабходных матэрыялаў для будучай прафесійнай дзейнасці, азнаямлення з навінкамі нотнай і спецыяльнай літаратуры. У гэтым напрамку ўзнікае і неабходнасць удасканалення ведання студэнтамі замежных моў для азнаямлення з замежнымі выданнямі.

Мяркуемымі шляхамі аптымізацыі прафесійнага ўзроўню падрыхтоўкі кіраўнікоў духавых і эстрадных аркестраў у ВНУ з'яўляюцца наступныя:

1) удасканальванне сістэмы выяўлення патэнцыяльных абітурыентаў з наступным адборам тых кандыдатаў, якія адпавядаюць неабходным патрабаванням;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) вызначэнне зместу ў навучанні студэнтаў гэтых спецыялізацый, які павінен уключаць пытанні гісторыі духавых, эстрадных аркестраў Беларусі, аналіз тэндэнцый іх развіцця і выяўленне тыповых праблем, вызначэнне месца і значнасці гэтых калектываў у структуры мастацкай культуры рэспублікі;

3) абавязковае расшырэнне саставу акадэмічнай групы першага курса на 20,8 % — 32 % (адпаведна 7—8 чалавек) у параўнанні з плануемай колькасцю выпуску маладых спецыялістаў для выяўлення патэнцыяльных прафесійных магчымасцей ужо на працягу І семестра. Гэта дазволіць, зрабіўшы неабходнае адлічэнне ўжо на пачатковым этапе навучання, арыентаваць студэнтаў не на "атрыманне дыплома", як гэта мае месца сёння, а на набыццё прафесіі ва ўсёй разнастайнасці яе аспектаў (павелічэнне акадэмічнай групы неабходна ўжо і таму, што на працягу навучання некаторыя студэнты бяруць акадэмічны водпуск, адлічваюцца, прызываюцца для праходжання ваеннай службы, пераводзяцца ў іншыя навучальныя ўстановы і да т. п.);

4) удасканальванне форм навучання практычным навыкам:

а) максімальнае выкарыстанне вучэбнага аркестра ў час вывучэння студэнтамі курса методыкі работы з духавым, эстрадным аркестрам, дырыжорска-аркестравай практыкі;

б) развіццё міжпрадметных кантактаў для ўдасканальвання вучэбнай праграмы, якая мае патрэбу ў больш цесных сувязях з тымі канкрэтнымі задачамі, якія давядзецца вырашаць будучаму кіраўніку ў сваёй рабоце;

в) увядзенне размеркавання студэнтаў на практыку ў час апошняга курса навучання на мяркуемае месца работы. У гэтым выпадку вытворчую практыку студэнт будзе праходзіць у базавым калектыве, а гэта будзе яго максімальна дысцыплінаваць і арыентаваць у самых нечаканых канкрэтных сітуацыях прафесійнай дзейнасці. Абарона вытворчай практыкі павінна праводзіцца выпускніком у базавым або створаным нанава калектыве ў прысутнасці выязной камісіі, а не па справаздачах;

5) абавязковае спалучэнне працэсу навучання з навукова-даследчай, навукова-вытворчай работай і мастацка-выканальніцкай дзейнасцю, што дазволіць будучым кіраўнікам вызначыць прафесійныя арыенціры для сваёй самастойнай работы:

а) знаёмства са спецыяльнай і нотнай літаратурай для напісання рэфератаў, курсавых работ па прафілюючых дысцыплінах спецыялізацыі з элементамі навукова-даследчай работы. Улічваючы новы падыход у падрыхтоўцы спецыялістаў па двухузроўневай сістэме "бакалаўр — магістр", для атрымання ступені бакалаўра, магістра студэнты павінны напісаць і абараніць адпаведныя дыпломныя работы;

б) вывучэнне сучаснага стану.духавых, эстрадных аркестраў (па матэрыялах лекцый, семінарскіх заняткаў, публікацый у друку, аналіз дзейнасці калектыву ў час праходжання вытворчай практыкі) з мэтай усведамлення асноўных праблем развіцця гэтых калектываў і пошуку шляхоў іх вырашэння;

в) канкрэтнае вывучэнне ўсіх накірункаў і асаблівасцей работы калектыву, у якім праходзіць вытворчая практыка, і складанне плана-канспекта з мэтай аналізу і выкарыстання ў будучай прафесійнай дзейнасці;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

г) падрыхтоўка дакладаў для выступлення на выніковых студэнцкіх навуковых канферэнцыях з паведамленнямі аб асаблівасцях і недахопах дзейнасці канкрэтных духавых, эстрадных аркестраў і іх кіраўнікоў з мэтай вызначэння агульных тэндэнцый развіцця калектываў;

6) неабходнасць кантролю не прамежкавага, а канчатковага выніку, які выпускнікі паказваюць у прафесійнай дзейнасці. Гэты вынік можа карэкціраваць, пры неабходнасці, накіраванасць вучэбнага працэсу па прадметах спецыялізацыі (да паказчыкаў эфектыўнасці канчатковага выніку мы адносім: стабілізацыю колькаснага і якаснага саставу калектыву, якім кіруе малады спецыяліст, наяўнасць творчай атмасферы і здаровы сацыяльна-псіхалагічны клімат у калектыве, прадуктыўнасць канцэртных выступленняў і якасць выканання твораў, уменне кіраўніка прафесійна выконваць інструментоўкі твораў з улікам саставу свайго аркестра, эфектыўную арганізацыю вучэбна-выхаваўчай і творчай работы як шматграннага працэсу па выхаванні ўдзельнікаў і да т. п.);

7) правільнае размеркаванне выпускнікоў з улікам дыферэнцыяцыі іх асобасных і дзелавых якасцей і першачарговай неабходнасці канкрэтнага спецыяліста ў тым ці іншым рэгіёне; выключэнне магчымасці пасрэдным спецыялістам выбіраць вакансіі па іншых спецыялізацыях (метадыст, мастацкі кіраўнік, дырэктар і да т. п., да якіх яны не падрыхтаваны). Лепшых выпускнікоў, якія валодаюць добрымі арганізатарскімі здольнасцямі, неабходна спецыяльна рыхтаваць на ўзроўні магістраў і актыўна рэкамендаваць іх на пасады мастацкага кіраўніка, загадчыка аддзела, намесніка дырэктара, дырэктара КАУ, але з абавязковым кіраўніцтвам духавым або эстрадным аркестрам.

У працэсе даследаванняў па дадзенай тэме, практыкі правядзення рэспубліканскіх семінараў для кіраўнікоў аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў было ўстаноўлена, што арганізацыя павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў калектываў пакуль яшчэ не мае стройнай сістэмы. Намі была зроблена спроба распрацоўкі такой сістэмы [9]. Акрамя таго, мы прапануем наступнае спалучэнне перспектыўных, на наш погляд, форм:

1) комплексныя кансультацыі па методыцы работы з духавым, эстрадным аркестрам ці інструментальным ансамблем, практыкум па развіцці мануальнай тэхнікі дырыжыравання, вывучэнне пытанняў музычна-тэарэтычнай падрыхтоўкі, інструментоўкі і г. д. (выклік у калектыў кансультантаў або атрыманне неабходных ведаў на цэнтралізаваным кансультацыйным пункце рэспублікі);

2) стварэнне двух- або трохгадовых курсаў падрыхтоўкі кіраўнікоў (якія маюць недастатковую падрыхтоўку, асабліва з сельскіх калектываў);

3) арганізацыя навукова-практычных канферэнцый у час правядзення аглядаў рознага ўзроўню (гэта дазволіць не толькі абмеркаваць вынікі агляду, але і практычна вырашыць набалелыя традыцыйныя праблемы, арганізаваць абмен вопытам паміж калегамі);

4) арганізацыя пры Беларускім інстытуце праблем культуры ці Беларускім універсітэце культуры пастаянна дзеючых семінараў-практыкумаў, на якіх вопытныя выкладчыкі, дырыжоры акажуць дапамогу кіраўнікам духавых, эстрадных аркестраў у асваенні канкрэтных практычных навыкаў;

5) фарміраванне развітай сістэмы курсаў павышэння кваліфікацыі, якая ўлічвае градацыю прафесійнай падрыхтоўкі кіраўнікоў калектываў. На такіх курсах, што праводзяцца раз у пяць гадоў, кожны кіраўнік зможа пазнаёміцца з апошнімі данымі шматлікіх даследаванняў, неабходнымі для яго дзейнасці, з найноўшай спецыяльнай нотнай і метадычнай літаратурай. Вывучэнне вучэбных праграм павінна абавязкова заканчыцца *пераатэстацыяй* прафесійнага майстэрства кіраўніка па ўсіх аспектах дзейнасці;

6) далейшае ўдасканальванне выпрабаванай формы рэспубліканскага семінара. На ім пажадана арганізаваць тэматычныя, праблемныя секцыі, у час работы якіх любы з удзельнікаў семінара можа запоўніць прагалы ў сваёй прафесійнай дзейнасці.

Асаблівага падыходу патрабуе праблема падрыхтоўкі кадраў для прафесійных калектываў духавых і эстрадных аркестраў. Падрыхтоўка кіраўнікоў аматарскіх эстрадных калектываў вышэйшай кваліфікацыі ажыццяўляецца ў Беларускім універсітэце культуры на кафедры эстраднай музыкі (для прафесійных калектываў такіх спецыялістаў у рэспубліцы не рыхтуюць наогул). Аналагічнае навучанне кіраўнікоў духавых калектываў праводзіцца ў гэтай жа навучальнай установе, а падрыхтоўка дырыжораў прафесійных аркестраў — у Беларускай акадэміі музыкі. Параўнальны аналіз падрыхтоўкі спецыялістаў для духавых аркестраў і па змесце, і па аб'ёме вучэбных планаў і праграм складваецца на карысць кафедры духавой музыкі Беларускага універсітэта культуры — у Беларускай акадэміі музыкі для студэнтаў, якія атрымліваюць кваліфікацыю дырыжора, не арганізавана аркестрава-выканальніцкая практыка з-за адсутнасці вучэбнага аркестра, хоць прафесійны дырыжор абавязаны ведаць аркестравы выканальніцкі працэс знутры; на дзяржэкзамене гэтыя выпускнікі не выконваюць у аркестры ўласныя інструментоўкі, а гэта найважнейшая ўмова расшырэння мастацкага рэпертуару калектыву; методыка работы з калектывам з мінімальным аб'ёмам 18 гадзін (ва універсітэце зараз — 121) падмяняецца методыкай работы над творамі і г. д.

У сувязі з тым, што ў цяперашні час назіраецца альбо знікненне з музычнай практыкі самадзейных калектываў як такіх, альбо іх трансфарміраванне ў аматарскія, прафесійныя калектывы (паркавыя саставы, гарадскія аркестры і г. д.), прапануецца наступны падыход да праблемы падрыхтоўкі кадраў:

1) у першую чаргу выпрацоўка аб'ектыўнай *канцэпцыі* навучання спецыялістаў з улікам пераемнасці (сістэма пачатковай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі) і арыентацыі на практыку функцыяніравання аматарскіх калектываў. У гэтым плане мэтазгодна вывучыць паслядоўнасць засваення ведаў на ўсіх этапах сістэмы навучання, выключыць наяўнае дубліраванне курсаў і распрацаваць кампактнае пагружэнне ў тую ці іншую дысцыпліну. Важна засяродзіць увагу на падрыхтоўцы выпускнікоў універсітэта для забеспячэння музычнага выхавання дзяцей у сярэднеадукацыйных школах, школах з мастацкім ухілам і школах мастацтваў (па відах мастацтваў), гімназіях, ліцэях і да т. п. з мэтай арганізацыі эфектыўнай работы па стварэнні творчых дзіцячых калектываў і ажыццяўленні мастацкага выхавання па вялікім рахунку (арыентавацца патрэбна на сістэмы музычнага выхавання і аду-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кацыі, якія існавалі ў Беларусі яшчэ з XVI да пачатку XX ст., а таксама ўлічваць прагрэсіўныя сістэмы мастацкага выхавання Японіі, Фінляндыі, Амерыкі, Германіі і іншых краін);

2) студэнтам, якія атрымліваюць ступень бакалаўра, прысвойваць кваліфікацыю "Кіраўнік духавога, эстраднага аркестра" вышэйшай катэгорыі (маецца на ўвазе аматарскі калектыў у адпаведнасці са спецыялізацыяй). Навучэнцам у вучылішчах культуры, мастацтваў рэспублікі павінна прысвойвацца аналагічная кваліфікацыя першай катэгорыі. У музычных жа вучылішчах падобная кваліфікацыя павінна быць знята наогул, бо яна не забяспечваецца адпаведнымі вучэбнымі планамі і практыкай у аматарскім калектыве;

3) студэнтам, якія атрымліваюць ступень магістра, пры ўмове ўсебаковай музычна-тэарэтычнай і спецыяльнай падрыхтоўкі прысвойваць кваліфікацыю "Дырыжор духавога аркестра" першай катэгорыі (маецца на ўвазе прафесійны калектыў);

4) каб атрымаць больш прэстыжную прафесійную кваліфікацыю "Дырыжор і мастацкі кіраўнік духавога аркестра", прэтэндэнт павінен прайсці курс навучання ў асістэнтуры-стажыроўцы Беларускай акадэміі музыкі.

Прапанаваныя шляхі вырашэння праблемы падрыхтоўкі дырыжораў духавых, эстрадных аркестраў (як аматарскіх, так і прафесійных калектываў) будуць садзейнічаць, на наш погляд, далейшаму развіццю выканальніцкага майстэрства аркестраў духавых інструментаў, эстрадных аркестраў і ўмацоўваць іх пазіцыі ў структуры мастацкай культуры Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА

*1. Каргин А. С.* Народное художественное творчество: Структура, формы, свойства. М., 1990; *Куликов Ю. М.* Культурологический аспект истории художественной самодеятельности // Народное творчество и современность. М., 1982; *Максимов В. Н.* Художественная самодеятельность: дефиниции и реальность // Народное творчество и современность. М., 1982; *Мазаев А. У.* К вопросу о изучении современного любительского ("самодеятельного") художественного творчества // Народное творчество и современность. М., 1982 і інш. *2. Малахава І. А.* Да пытання аб вывучэнні аматарства як феномена культуры // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1993. Вып. 12. С. 151—158. *3.* Текущий архив ВНМЦ культпросветработы и народного творчества (Москва). Дело "Первый Всесоюзный фестиваль самодеятельного художественного творчества", раздел "Всесоюзный праздник духовой музыки" (стенограмма научно-практической конференции по проблемам развития духовой музыки. Минск, 30 мая 1977). Л. 3—4. *4. Алексеева Л.* Диалог ученых // Клуб и художественная самодеятельность. 1981. № 9. С. 3. *5. Карацееў А. Л.* Аптымальныя параметры кваліфікацыйнага ўзроўню дырыжораў і арганізацыя работы з удзельнікамі аркестраў духавых інструментаў як асноўныя якасна-змястоўныя аспекты функцыяніравання прафесійных і аматарскіх мастацкіх калектываў // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1993. Вып. 12. С. 46—77. *6. Грыгаровіч Я. Д.* Спецыфіка арганізацыі самастойнай дзейнасці студэнтаў музычных спецыялізацый // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1992. Вып. 11. С. 79—82. *7. Вершинин П. П., Бельчина Н. И.* О нормировании затрат времени студентами на самостоятельную учебную работу // Проблемы высшей школы. Киев, 1976. Вып. 25. С. 106—110. *8. Коростелева Т. А.* Некоторые формы активизации самостоятельной работы студентов... // Самостоятельная работа студентов: Мат-лы науч.-метод. конференции. Омск, 1973. С. 22. *9. Карацееў А. Л.* Шляхі фарміравання цэласнай сістэмы павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў і ансамбляў // Нацыянальная культура як аснова зместу навучання і выхавання студэнтаў: Тэз. дакладаў міжнар. навук.-метад. канферэнцыі. Мн., 1993. Ч. 2. С. 37—39.

РЕПАЗІТОРЫЙ БГУКІ